УДК 821.161.3-13»1930»

# ПАЭТЫЧНЫ ЭПАС П. БРОЎКІ ПЕРАДВАЕННАГА ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯ: СУЧАСНЫ ПОГЛЯД

*Борбат Тацяна Іванаўна*
загадчык кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый
установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. А. Куляшова»;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

*Ячмянёва Ірына Мікалаеўна*
дацэнт кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства
ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. А. Куляшова»;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

*У артыкуле разглядаюцца паэмы П. Броўкі 1930-х гадоў, адзначаюцца іх ідэйна-тэматычныя, стылёвыя адметнасці, акрэсліваюцца ацэнкі ў сучасным літаратуразнаўстве. Адзначаецца, што пра ўбачанае і перажытае паэт пісаў у стылі свайго часу – сцісла, дакладна, аператыўна, у форме рамантычна-прыўзнятага, павышана-экспрэсіўнага, але часам і павярхоўнага адлюстравання рэчаіснасці.*

Пятрусь Броўка – шырокапрызнаны савецкі пісьменнік, публіцыст, перакладчык, без яго творчасці нельга ўявіць шляхі і тэндэнцыі развіцця беларускай літаратуры XX стагоддзя. На долю паэта выпаў лёс быць сведкам і ўдзельнікам супярэчлівай на гістарычныя падзеі эпохі, стаць летапісцам свайго часу. Таму і творчую спадчыну паэта немагчыма разглядаць па-за кантэкстам часу, пераломных момантаў гісторыі нашай дзяржавы, сувязі тут не толькі знешнія, але і глыбінныя, на ўзроўні філасофскага і псіхалагічнага асэнсавання рэчаіснасці.

Захоплены вірам новага жыцця і жаданнем паказаць сваю далучанасць да перабудовы свету, на пачатку 1930-х гадоў П. Броўка звяртаецца да паэтычнага эпасу. Як і ранняя лірыка, яго паэмы вылучаюцца шчырасцю аўтарскай інтанацыі, актуальнасцю закранутых праблем, хоць ім і шкодзіць прасталінейнасць і дэкларацыйнасць.

Этапным для паэта творам стала паэма “Праз горы і стэп” (1932), напісаная “паводле матэрыялаў Самарскай дывізіі”. Абапіраючыся на творчы вопыт М. Ціханава, Э. Багрыцкага, М. Чарота, П. Броўка стварыў самабытную і пранікнёную паэму аб гераізме радавых байцоў рэвалюцыі. У абагульненай карціне цяжкага паходу чырвонаармейцаў перад чытачом паўстае маналітная, адзіная “па веры і гарту” людская грамада, нястрымная ў імкненні да перамогі. І ніякія суровыя выпрабаванні не здольны спыніць яе. Гэту нястрымнасць, імклівы рух, паэт передае дынамічным, “маршавым” па сваёй рытмічнай структуры гучаннем верша: “*На коней, брат! // Там белы гад! // Мацней агонь! // Дабіць яго! // І пайшлі, // Маладымі і новымі, // І пайшлі, // Ажно вецер прысеў*” [2, с. 189]. У творы, як і ў многіх ранніх вершах, відавочная творчая арыентацыя П. Броўкі на традыцыі У. Маякоўскага. Малады паэт імкнецца дасягнуць маштабнасці, прамоўніцкай гучнасці, захапляецца эфектнымі рыфмамі, перарывістымі рытмамі.

Аповед у паэме вядзецца ад імя радавога ўдзельніка паходу. Герой распавядае аб перажытых цяжкасцях па-салдацку адкрыта, нават грубавата (“распетрылі чэрці нас”, “да зубоў злосць пераела ўсіх нас”). Маналогі байца ўнутрана ўсхваляваныя, часам драматычныя. Паэт шырока карыстаецца прыёмамі гіпербалізаванага, абагулена-рамантычнага асвятлення гістарычных падзей. Знямоֱжаныя голадам чырвоныя байцы вытрымалі і шматлікія атакі белагвардзейцаў, і тыфозную агонію, і “раз’юшаны рогат” буруна, выйшлі пераможцамі: “*Мы ж прайшлі гэта пекла, // Хоць і шмат пагублялі <…> // Яшчэ больш гартаваннымі // Ў полымі сталі*” [2, с. 191]. Былыя грозныя паходы паўстаюць цяпер перад героем у арэоле славы і гераізму. Гераічнае, раскрытае праз трагедыйнае, набывае ў творы “асабліва моцную эмацыянальную сілу мастацкага ўздзеяння” [1, с. 1].

Аб далейшых пошуках П. Броўкі ў галіне ліра-эпічнай паэзіі сведчылі паэмы “Так пачыналася маладосць” і “1914”, напісаныя ў 1933 годзе. У паэме “Так пачыналася маладосць” П. Броўка імкнецца застацца на пазіцыях гістарызму, расказаць пра лёс свайго пакалення. Але “праўда факта” ў творы не перарастае ў мастацкую праўду – падзеі не асэнсаваны эстэтычна. Паэма ўспрымаецца як расказ пра рэвалюцыйныя падзеі, а не як твор пра чалавека – удзельніка гэтых падзей. Галоўны герой паэмы – камсамол, які прайшоў праз шматлікія выпрабаванні і выстаяў: “*Ад рабочых нізін, ад падпольніцкіх нор, // Ад пакуты і здзекаў бясконцых, // Праз засценкі турмы, праз жахлівы тэрор // Вы прайшлі, камсамольцы!*”. Многія радкі паэмы гучаць залішне дэкларатыўна і пафасна, ужываюцца агульныя, абыходкавыя фразы: “*Камсамол не знае // Ні тугі, ні суму, // Камсамольскім сэрцам // Ў сцюжу не астыць. // … Армія Чырвоная – // Першая ў свеце // Выйшла на рашучы // І астатні бой* <…>” [2, с. 191]. Таксама ў творы шмат агульных, плакатных радкоў, пераважаюць стэрэатыпы і штампы. Не вылучаецца паэма і навізной вобразна-выяўленчых сродкаў, стылёва нявытрымана. Паэту яшчэ бракуе свайго паэтычнага зроку, свайго стылю.

Пра ўбачанае і перажытае паэт пісаў у стылі свайго часу – сцісла, дакладна, аператыўна, у форме рамантычна-прыўзнятага, павышана-экспрэсіўнага, але часам і павярхоўнага адлюстравання рэчаіснасці.

Адзін з лепшых твораў П. Броўкі передваеннага дзесяцігоддзя – паэма “1914”. Твор узнік як успамін пра няшчасці аднавяскоўцаў, якім яшчэ падлеткам будучы паэт дапамагаў пісаць лісты на фронт. Паэма моцная сваім антываенным пафасам, паказам антычалавечнай сутнасці імперыялістычнай вайны, выкрыццём вінаўнікаў народных няшчасцяў.

Трагізм імперыялістычнай вайны раскрываецца ў творы праз лёс селяніна Сымона Перагуда, які самаахвярна ваяваў за сваю “айчыну і веру”. Вярнуўшыся з фронту, ён цешыць сябе ілюзіямі, што пасля перамогі будзе добра жыць: “*Вось тады спакойна // Будзем разжывацца, // Дома знойдзем долю // Шчасную сваю, – // Кожнаму герою // Пры уласнай хаце // Дзесяцін на дваццаць // Хутар адаб’юць*” [2, с. 200–201].

Глыбокім драматызмам прасякнута сцэна сустрэчы бязрукага і бязногага Перагуда са сваёй сям’ёй і вёскай. Сымон яшчэ бадзёрыўся, сяляне ж “стаялі нямымі”, а жонка “білася вобзем і прасіла збавення”, “яна ногі шукала заместа крыжоў” [2, с. 211].

У параўнанні з ранейшымі творамі паэта, мастацкая палітра паэмы “1914” узбагацілася новымі фарбамі. Выкрываючы служак цара і бога, П. Броўка шырока выкарыстоўвае сатырычныя сродкі мастацкай выразнасці. Гэта назіраецца ў выбары імён “адмоўных герояў” (поп Анемпандзіст, станавы Верхаплюйкін), іх партрэтных характарыстыках (айцец Анемпандзіст з мышынымі вусамі “выкацiўся бочкай з крыжам залатым”) [2, с. 193]. Адзначым, што паказ вінаватых у няшчасцях Сымона заснаваны на прынцыпе кантрасту падкрэслена сацыяльнага характару: “*Бабы клікалі бога – // Ён наводзіў марціры, // Бог распешчаны, // Сыты панок! Ён па штабах хадзіў // Ў генеральскім мундзіры, // Дзе там слухаць такому // Пакутных жанок.*” [2, с. 205–206].

Сцэна “ўшанавання” Сымона, “кавалера ўсіх крыжоў і медалёў”, “выпісана з такім дакладным сатырычным прыцэлам, што не пакідае ніякага сумнення ні ў фальшы напышлівых прамоў царскага чыноўніка, ні ў бязглуздасці ўсяго гэтага ка-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

зённа-патрыятычнага маскараду" [3, с. 31]. У выніку акрэслена вымалёўваецца непераадольная бездань, якая заўсёды існавала паміж тымі, хто сядзеў "у першай ложы тэатра вайны", і тымі, хто былі ў акопах, першымі траплялі пад варожыя кулі.

У апошніх строфах паэмы гучыць праклён войнам і тым, хто іх распачынае: *"Сымон жа крыўду дзён спазнаў, // Цану спазнаў ён абяцанкам, – // Зубамі ўсе медалі рваў, // Як непатрэбныя бляшанкі. // <…> Забіты, кінуты на здзек, // Ярмо зрываючы прынук, // Качаўся ён, паўчалавек, // Крычаў зняможна: – Прэч вайну!"* [2, с. 1].

Паэма П. Броўкі "Кацярына" (1938), напісаная ў песенна-паэтычным стылі, не стала творчым здабыткам паэта і цікавіць нас перш за ўсё як пэўны этап у творчай біяграфіі паэта. У аснову сюжэта паэмы пакладзены прыём антытэзы – проціпастаўлення горкага лёсу гераіні ў часы прыгнёту і яе шчаслівага жыцця ў калгасе. Праз лёс галоўнай гераіні паэмы – парабчанкі Кацярыны – П. Броўка хацеў паказаць лёс усяго беларускага народа, яго шлях да свабоды. Аднак твор атрымаўся схематычным і тэндэнцыйным. Пры абмалёўцы рэчаіснасці аўтар карыстаўся выключна двума колерамі – чорным і белым. Жыццё Кацярыны ў дарэвалюцыйны час намалявана цёмнымі фарбамі, "шчасця, ветлівага слова ў хаціне не было". Дзяўчына з ранку да вечара дапамагала бацькам па гаспадарцы, працавала непакладаючы рук: "*<…> Розным клопатам заняты // рукі кволыя яе: // Перамыць анучак многа, // дроў на паліва знайсці, // Чыста вымесці падлогу. Столь ад пылу абмясці.*" [2, с. 242]. Шмат пакут давялося пераЖыць дзяўчыне і пасля смерці бацькоў! "Але ці не збядніў паэт вобраз Кацярыны, выявіўшы толькі яе пакуты? Ці ж нельга было паказаць яе ў дзяцінстве з песняй, з усмешай на вуснах?" – слушна адзначае М. Ярош [3, с. 35].

Тэндэнцыйнымі з'яўляюцца і старонкі паэмы, дзе даволі павярхоўна і паспешліва апавядаецца аб жыцці Кацярыны ў калгасе. Яна хутка становіцца перадавой калгасніцай, атрымлівае падарункі і прэміі, у Маскве прысутнічае на з'ездзе перадавікоў, дзе яе ўзнагароджваюць ордэнам. Пры гэтым аўтар павярхоўна падае сцэны працы гераіні ў калгасе, не выдзяляе трапных штрыхоў у абмалёўцы яе знешняга вобліку, не выяўляе глыбіні пачуццяў і перажыванняў Кацярыны.

З вышыні сённяшняга часу наўрад ці можна лічыць такія творы сапраўднымі дасягненнямі. Мы нагадваем пра іх, каб выдзеліць асобую атмасферу перабудовы ў краіне, заснаваную на шчырым і самаахвярным энтузіязме мас, уздыме народнага духу. Гэта атмасфера і была калыскай натхнення, што прывяло паэта да ўсхваляванага, эспрэсіўнага слова.

Пры ўсіх крытычных адносінах да твора неабходна адзначыць – узбагацілася паэтыка творчасці П. Броўкі (каларытнасць эпітэтаў, метафар, гіпербал), узрасла павага да слова, яго мелодыкі, змястоўнай эмацыянальнасці: *"Ды жабрачы лёс не змерыць, // Прасвятлення не відно; // Выганяеш гора ў дзверы, – // Гора сунецца ў вакно // Паглядзіш, куды ні кінеш, За бядой бяда яшчэ… // Села гора гаспадыняй // У хаціне на куце. // Надышло зімовым шляхам // У пагорбленых санях, // Засланіла шыбы страхам, // Смерцю стала на кутах*" [2, с. 243–244].

Сучасныя літаратуразнаўцы слушна адзначаюць, што ў творчасці паэта "шмат прахаднога, аднадзёнкавага, нават выпадковага, а характэрнае паэтава "Я" выявілася хіба толькі ў паасобных вершах..<…>" [3, с. 142]. Безумоўна, не ўсё з творчай спадчыны П. Броўкі вытрымала выпрабаванне часам і на мастацкасць. Не ўсё было арганічным, цэласным. Аднак біяграфія паэта складаецца не толькі з асобных, вырваных з жыцця, старонак. Гэта – суцэльная кніга паэтавай душы і яго пошукаў.

Так, нягледзячы на рыторыку, ілюстрацыйнасць і пэўны схематызм, такія творы спрыяюць асэнсаванню і разуменню сутнасці часу і рамантыкі другой паловы 1920-х – 1930-х гадоў, яны ў пэўнай меры даюць уяўленне пра даваенную эпоху, паказваюць яе маштаб, дапамагаюць зразумець пачуцці тагачаснага маладога пакалення. Красамоўная паэтыка, узнёслая дэкларатыўнасць – адзнакі часу, але не толькі ў адных яго знешніх выявах, а і ў псіхалагічна праўдзівай апанаванасці людзей масавым парывам у будучыню, у агульным характары светаадчування.

**Спіс выкарыстанай литаратуры**

1. Борбат, Т. І. Паэма П. Броўкі "Праз горы і стэп": спроба пераасэнсавання / Т. І. Борбат, І. М. Ячмянёва // Материалы науч.-метод.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

конференции преподавателей и сотрудников по итогам науч.-исслед. работы в 2007 г., 7–8 фев. 2008 г. / под ред. А. В. Иванова. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2008. – С. 177–178.
2. Броўка, П. Збор твораў : у 4 т. / П. Броўка. – Мінск : Беларусь, 1965–1966. Т. 1 : Вершы, паэмы : 1926–1940. – 1965. – 356 с.
3. Камейша, К. На паверцы імёны : Пятрусь Броўка / К. Камейша // Полымя. – 2005. – № 12. – С. 142–145.
4. Ярош, М. Пятрусь Броўка : Нарыс жыцця і творчасці / М. Ярош. – Мінск : Народная асвета, 1983. – 120 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова